# ПАДАРУНАК МАЛОЙ РАДЗІМЕ

**Маскоўскі бізнесмен Аляксандр ЗАРЫБКА нарадзіўся ў Пінску, скончыў дзіцяча-юнацкую спартыўную школу № 3. І шмат гадоў выступаў у якасці фундатара для сваёй школы, якая паспрыяла станенню яго характару. А пяць гадоў таму пабудаваў Акадэмію футбола — адмысловы спартыўны аб'ект, які стаў упрыгажэннем горада і служыць справе спартыўнага выхавання маладога пакалення.**

Што ж уяўляе сабой акадэмія? Гэта чатыры палі стандартнага памеру, адно з якіх падаграваецца, адно мае купал, які дазваляе трэніравацца круглы год. Тут кампактна размешчаны трэнажорная зала, вучэбны кабінет, распранальні з душавымі, адміністрацыйнае памяшканне — адным словам, ёсць усё для паспяховых заняткаў спортам. Зараз у спартыўным комплексе займаецца каля 500 навучэнцаў. Аказваюць і платныя паслугі.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**